# ВОДГУК

аб аўтарэфераце дысертацыі Панова Сяргея Веніямінавіча «Развіццё школьнай гістарычнай адукацыі ў Рэспубліцы Беларусь» на атрыманне вучонай ступені доктара педагагічных навук па спецыяльнасці 13.00.01 – агульная педагогіка, гісторыя педагогікі і адукацыі

Азнаямленне са зместам аўтарэферата сведчыць аб тым, што дысертацыйнае даследаванне Панова С.В. адпавядае заяўленай спецыяльнасці. Тэма дысертацыі «Развіццё школьнай гістарычнай адукацыі ў Рэспубліцы Беларусь» суадносіцца з гісторыяй адукацыі і, такім чынам, сведчыць аб гісторыка-педагагічным тыпе даследавання.

Саіскальнікам у якасці вызначанай ім мэты даследавання вывучаюцца канцэптуальныя асновы школьнай гістарычнай адукацыі як інстытуцыянальна-ведамаснай сістэмы і як сацыягуманітарнай з'явы. Такі комплексны характар сведчыць аб навізне даследавання школьнай гістарычнай адукацыі як шматкампанентнай і шматфактарнай педагагічнай сістэмы. Спецыфіка такога даследавання заключаецца ў спалучэнні метадалагічных асаблівасцей гісторыі адукацыі як галіны педагагічнай навукі і метадалагічных прынцыпаў гістарычнага пазнання як галіны гістарычнай навукі.

Саіскальнкам удакладнены канцэптуальна-метадалагічны, інстытуцыянальна-функцыянальны, зместава-дзейнасны, сацыяльна-аксіялагічны кампаненты школьнай гістарычнай адукацыі з адпаведнымі ім фактарамі. Сярод іх саіскальнікам у якасці дэтэрміналты вызначаецца дзяржаўная гістарычная палітыка ў Рэспубліцы Беларусь, накіраваная на замацаванне беларускай нацыянальнай канцэпцыі гістарычнага мінулага і беларускай мадэлі гістарычнай памяці. Структурныя кампаненты і фактары развіцця школьнай гістарычнай адукацыі з іх структурна-зместавай канкрэтызацыяй прадстаўлены саіскальнікам у сканструяванай ім мадэлі вывучэння працэсу развіцця школьнай гістарычнай адукацыі. Таксама саіскальнікам вызначаны і ахарактарызаваны чатыры этапы ў працэсе развіцця школьнай гістарычнай адукацыі ў Рэспубліцы Беларусь. Асновай для такой перыядызацыі сталі вызначэнне канцэптуальных асноў школьнай гістарычнай адукацыі ў трох пакаленнях канцэпцый, стандартызацыя ў трох пакаленнях адукацыйных стандартаў, канструяванне зместу ў пяці пакаленнях школьнай вучэбнай гістарычнай літаратуры, структураванне зместу адукацыі па канцэнтрычным і лінейным прынцыпах.

Саіскальнікам асаблівая ўвага надаецца характарыстыцы мэты і задач школьнай гістарычнай адукацыі, прынцыпам абнаўлення, структуравання і адбору яе зместу, функцыяналу, якія вызначаюцца ў Канцэпцыі гістарычнай адукацыі ў сярэдняй школе Беларусі 1991 г., Канцэпцыі вучэбнага прадмета «Сусветная гісторыя. Гісторыя Беларусі» 2009 г., Канцэпцыі школьнай гістарычнай адукацыі ў Рэспубліцы Беларусь 2022 г.

Вартымі увагі падаюцца канцэптуальныя асновы развіцця школьнай гістарычнай адукацыі ў якасці сацыягуманітарнай з'явы. Да іх, па меркаванні саіскальніка, адносяцца міждысцыплінарныя канцэпты гістарычнай памяці, нацыі і нацыянальнай ідэі, нацыянальна-культурнай ідэнтычнасці, беларускай дзяржаўнасці, традыцыйных каштоўнасцей беларускага грамадства. Такі погляд на школьную гістарычную адукацыю стасуецца з праблематыкай даследавання, арыентаванай на вывучэння пытання аб тым, якім чынам школьная гістарычная адукацыя выконвае функцыю захавання і трансляцыі гістарычнай памяці. Асаблівая ўвага, зыходзячы са зместу аўтарэферата, саіскальнікам надаецца вызначэнню нацыястваральнага патэнцыялу гісторыі Беларусі ў працэсе фарміравання нацыянальна-культурнай ідэнтычнасці вучняў.

Зыходзячы са зместу аўтарэферата, характэрнай рысай даследавання можна лічыць яго міждысцыплінарнасць. Аб гэтым сведчыць комплексная характарыстыка саіскальнікам рэалізацыі ў змесце школьнай гістарычнай адукацыі як агульнапедагагічных падыходаў (культуралагічнага ў пераемнасці з кампетэнтнасным пры разуменні зместу школьнай гістарычнай адукацыі як сацыяльнага вопыту сучаснага беларускага грамадства), так метадалагічных падыходаў акадэмічнай гістарычнай навукі (фармацыйны, мадэрнізацыйны, цывілізацыйны) якія спалучаюцца з прадметна-гістарычнымі (гісторыка-крыніцазнаўчы, гісторыка-антрапалагічны, гісторыка-аксіялагічны).

Прагнастычнай навізной даследавання, аб чым сведчыць змест аўтарэферата, можна лічыць актуалізацыю светапоглядна-выхаваўчай функцыі школьнай гістарычнай адукацыі,якая прадугледжваерэалізацыю сацыяльна-педагагічнай мадэлі патрыятычнага выхавання вучнёўскай моладзі, што звязана з ажыццяўленнем Праграмы патрыятычнага выхавання насельніцтва Рэспублікі Беларусь на 2022–2025 гг.

Варта абазначыць асабісты вопыт саіскальніка ў дасягненні мэты дысертацыйнага даследавання, звязаны з падрыхтоўкаў некалькіх пакаленняў вучэбнай гістарычнай літаратуры для ўсіх трох ступеняў агульнай сярэдняй адукацыі.

Аўтарэферат дысертацыі Панова С.В. «Развіццё школьнай гістарычнай адукацыі ў Рэспубліцы Беларусь» сведчыць аб адпаведнасці навуковай кваліфікацыі саіскальніка ступені доктара педагагічных навук па спецыяльнасці 13.00.01 – агульная педагогіка, гісторыя педагогікі і адукацыі.

Прафесар кафедры «Менеджмент»
установы адукацыі
«Беларускі нацыянальны тэхнічны ўніверсітэт»,
доктар педагагічных навук, прафесар У.Ф. Валадзько

Управление по работе с персоналом

Свидетельствую подлинность подписи
Зам. начальника управления по работе с персоналом
« 11 » 02 20 25 г.